БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш петыту на 1-й стран. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 5. Менск. Чэцьвер 28 сакавіка 1918 г. Год I.

Менск 28/III.

Перада мной дарагая памятка,—кніга: «Вымирающая деревня». А. I Шынгарова, гэтаго прэдстаўніка старай расійскай інтэлігэнцыі.

Апісываюцца 2 вёскі у чорназёмнай Варонежскай губэрні каля Дону. Зямлі у іх мала, 320 дзесянцін дано на 395 рэвізскіх душ. Каб ні памерці з голаду яны арэндуюць 348 дзесяцін у памешчыкаў. Нідаімак за імі 3400 руб.. За усёй губэрніяй нідаімак 12 мільёнаў руб.. Трэцяя часьць гаспадароў ні мае каней, чацьвертая часьць ні мае кароў. Сьвіней наогул па 1 шт. на двор. Палавіна людзей шукае заработку на старане. Шынгароў і статыстык Анненскі кажуць, што гэтак выглядаюць бадай усе вёскі цэнтральнай Расіі. «Галадаючыя і вымiраючыя могуць быць толькі пагромшчыкамі» піша Шынгароў.

Пракаповіч піша у кнізе «Аграрный вопросъ въ цифрах» У 1861 г. селянам далі зямлі менш за працоўную норму на 44 мільёны дзэсяцін, т. е. частка селянскіх земляў была адрэзана; у 21 чорназёмных губэрніях ад селянскіх грунтаў было адрэзана каля $^{1}/_{4}$ часьці, а у заходніх 9 губэрніях Беларусь)—40% зямлі дададзена селянам ад памешчыкаў(. Нішчэння маёнткаў у 1906 годзе абхапіўшы малазямельную Вялікоросію, амаль ні праяўлялося на Беларусі.

Хаця на Беларусі селяне мелі больш зямлі. але зямельная рэформа на карысьць народа ні павінна быць адложана. Без соцыяльна-эканамічнай рэформы край ні можа нормальна разьвівацца. Тое ці іншае рашэнне аграрнай справы цесна зьвязана з нацыянальным разьвіцем беларускаго племяні.

Усякаму ясна, якія агромныя матэр'яльныя і моральныя страты прынесьлі Беларусі пачаўшыя тут наводзіцца пры большэвікох «парадкі», каторыя канчаліся пагромамі вялікшых гаспадарак. I што у гэтым беларускае селянство вінавата меней за усіх, так само павінна быць ясным. Тамака дзе селяне пад'юджываныя агульна-расійскім рэвалюцыйным псіхозам, ні ведаючы каго ім у канцы канцоў трэба слухаць і каму можна верыць, і як больш за расійцаў культурныя і гаспадарныя земляробы, ні хацелі спаўняць прыказаў і дэкрэтаў «ваенна-рэволюціонной» улады аб падзеле двароў,—тамака зьяўляліся «таварышы» с Тулы ці Варонежу і з дзікай энэргіяй прыступалі да «соцыялізацыі» усяго, уключаючы нават бялізну.

Што-ж дзіўнаго, што часамі і селяне бачучы такі грабунак, пачыналі памагаць «таварышам».

Вінаваціць цяпер селян за большэвіцкія эксцэсы у нашым краю ніхто, сумленны чалавек ні павінен. Мацнейшыя і сьвятлейшыя за іх людзі, каторых рэвалюцыя рабіла міністрамі, і тыя ні маглі аставацца вернымі сваім прынцыпам, а зьбіваліся на дэмагогію. А селян душыў царскі урад,трымаючы у астрозе абрусіцельнай, ніграматнай, беднай, «начальнай» школы і паліцэйскай апекі. А потым бальшэвікі пачалі убіваць у іх свой прымусовы, паліцэйскі соцыялізм.

Нізалежнасьць Беларусі.

25 сакавіка Рада Беларускай Рэспублікі абвесьціла нізалежнасьць Беларусі. Ні гледзючы на страшэнную аппазыцыю нібеларускіх элемэнтау Рады, беларуская частка яе на гэты раз аказалася нізломнаю. Тое бязвыходнае палажэнне, у якім знаходзіцца цяпер нашая Бацькоўшчына, скасавало усе рожніцы паглядаў між беларусамі. Хто беларус,—той за нізалежнасьць.

Нізалежнай дзяржаві Беларускай ні усьміхаецца будучына. Прывыкшы да няволі і пакоры, народ беларускі ні стварыў моцных арганізацый, і цяперака, як і уперад, можа тэлькі больш ці менш голасна пратэставаць, патрэбаваць, але ні можа сам браць, сам тварыць свае жыцце. Бязсільны і безабаронны ён, як і заўсёды, залежыць ад чужой волі і міласьці.

Земля беларуская спустошаная вайной падзеляна на часткі. Вырастаючыя дзержаўныя суседзі—Польшча, Літва, Украіна так само хочуць адарваць—і пэўна ім гэта удасца—значные кавалкі беларускай тэррыторыі. Але калі і пры найгоршым раздзелі, хаця кавалак зямлі беларускай адтрымае рэальную волю і нізалежнасьць, дык усе роўна гэтым будзе забязпечана нашая нацыянальная будучына. Усякі раздзел грозны тым, што у адзеляных часьцінах, дзякуючы штучным перагародкам будзе разьвівацца культура асобнымі дарогамі, будуць безкарысна траціцца сілы народныя на адну і тую ж працу. Пры гэтых варунках культурнае разьвіцце усеж мажліва, ні гледзячы на усе перашкоды. Вось жа агледаючыся на сучасны момант, мы з усей пэўнасьцей можым сказаць: «калі ні згінулі да гэтаго часу, дык цяпер ні згінем».

Каб адбараніць сваю зямлю ад варагоў, каб паладзіць экономічнае і дзяржаўнае жыцце Беларускай Дзяржавы прыдзецца абаперціся на дужэйшаго суседа. Трудна цяпер сказаць на катораго с суседзяў сваіх абапрэцца маладая рэспубліка. Мінскае Беларускае Прэдстаўніцтво ясна паказуе на Гэрманію, мейсцовые самоуправы, выбраные у часі расійскай рэвалюцыі, пры панаванні на беларусі усякіх «земгусарскіх» расійскіх партый, катэгорычна патрабуюць фэдэрацыі з Расіяй. Асобныя палітычныя группы выказуюцца за хаўрус з Украінай, Літвою, Польшчаю. А большасьць Рады Рэспублікі стаіць на группе поўнай нізалежнасьці Беларусі. Апошняя дарога мусіць такі найлепшая. У справі дзяржаўных адносін ні патрэбна ані прынцыпіяльнасьці, ані пачуцця. Трэба добра агледзіцца, трэба патаргавацца і трэба ісьці у такім хаўрусі, ад якога найбольш карысьці іменна для свайго народу, для яго нацыянальнай і эконамічнай справы. Сьпешацца німа чаго. Трэба памятаць, што абавязкам усіх добрых беларусаў цяпер ёсьць—выйграць для беларускаго народу максімум карысьці. А у ігры самае глаўнае—спакойнасьць і вытрывалась.

Л. Б.

„Беласток Гародня, а мо' і Вільня". *)

Яшчэ ні абсохло пяро, каторым мы пісалі пратэст проціў польскіх захватных плянаў на Смаленшчыну, а ужо прыходзіцца сказаць сваё слова аб іншай падобнай справе. Нідаўна варшаўская «Gazeta Narodowa» аб'ясьняла сваіх чытачоў, што гэта — польская «racja stanu» і як яе трэба цяпер разумець. Вось жа гэная racja, паводле «Gaz. Nar.». павінна быць ні толькі дошкай ратунку для палякоў, але і дзьвярмі ў будучыну новай Польшчы. Аўтор стацьці, ацэніваючы усё гэтае значэнне, піша:

«Урэшці збудзіўшаеся народнае учуцце пазвалне працягнуць руку па набыткі для Каралеўства, гдзе яны магчымы: у бок Беластоку, Гародні, мо' і Вільні. З газэт ведама, што літоуская справа яшчэ ні развязана. Справа ўніі, справа Вільні ні праіграна і бязспорна Нямеччына ў гэтай справі мае сільны голас. Знакам тым, паяўляюцца новые магчымасьці, поле да працы цяжкай і поўнай адказу за яе»...

Мо' і Вільня, мо' і Менск, мо' і Смаленск... Далібог дзівавацца трэба, як верны палякі сваей задачы на Усходзі! Ды беларусы завуць гэта іначэй, па іхняму—гэта вырэзыванне жывога мяса с чужой спіны—беларускіх абшараў з беларускай тэрыторыі. У чым віна наша, што нас палякі так без ўстыду хочуць рэзаць?! Польская racja stanu гэта racja воўка з казкі Крылова, каторы сказаў барану:

«Твая віна, што мне есьці хочыцца»...

*) «Гоман» № 25.

Праўда, што, калі падобные польскай, racii stanu возьмуць верх над голасам народаў і жаданнем самаадзначэння, могуць і Вільня, і Менск, і Смаленск апынуціся ў новай няволі... Ды у адным нельга сумлевацца, што справа уніі Польшчы з Літвой і Беларусью праіграна безпаваротна, і па камандзе з Варшавы, каліб яна нават і ўшчэмілася і перашкаджала нам будаваць ўласны дзяржаўны лад, ніякай уніі ні будзе. Лепш нам быць суседзямі палякоў, чымсі мець з німі супольную хату.

А. Р.

Скрыпты шовініста.

Часамі дзіву дасіся чалавек: адкуль такіе спрытные людзі бяруцца?

У добрай кумпаніі ён табе анэгдотамі як с торбы сыпе, цікавымі апавяданнямі і вясёлымі жартачкамі нікому занудзіцца ні дасьць; у новаго павятоваго начальніка праз дзень сваім чалавекам робіцца—і частуя пана начальніка сьвежай цыгарай, і памагае выбіраць пані начальніцэ матэр'ял на сукню, і падкідае на руках Мішэньку і Володзеньку, і робіць строгую нагану кухарцэ за перасмажэных курчатаў.

На хрэзьбінах, імянінах, вясельлях, хаўтурах,—паўсюдах ён. З усімі ён знаёмы і усе яго ведаюць, прыймаюнь і любяць, як учціваго і патрэбнаго чалавека.

I нікога ні дзівіць, калі у тэстамэнце хцівай, любіўшай катоў і мопсаў больш за сіротаў-ўнучак, старой квотніцы, яму акажуцца запісанымі дзесяць тысячаў, ці калі шчасьлівым ўладаром спорнаго кавалку мясцоваго грунту, за які 50 гадоў ішлі суды паміж месцам і сіроцкім судом, акажацца ён-жа, хаця-б імя яго ні разу ні ўспаміналася у працягу доўгалетняй спрэчкі.

Нават ні прыгадаеш, што с такога чалавека спадзявацца можна.

Праўда, часамі абыватэль бачыць, як да лежачаго у

нечыяй шкатуле золата працягваецца пекная, ценкая, з залатымі персьцёнкамі на артыстычных доўгіх пальцах, з брыллянтовай сьпінкай у белым манкеце, адцянёная рукавом сурдута с чыстаго ангельскаго сукна, таемная, вісячая ў паветры, рука.

Працягваецца асьцярожна, скрадаючыся, здаецца аглядуючыся навокал і пры найменьшай трывозе, хаваючыся сярод белаго дня німа ведама гдзе.

І хаця здаецца абывацэлю, што ён ведае гэтую руку, бачыў гэтые пальцы, картуючымі калоду для вячэрняго сямейнаго прэфэрансіка, але прамільгнуўшая візыя нічога ні застаўляе ў памяці і стасункі да спрытнаго чалавека астаюцца найлепшымі.

Ен усё і усюцых, гэты шчасьлівец і з усяго скарыстае!

На такія, крыху нават зайздосныя, мысьлі можа навясьці кавалачак с хронікі адной з тутэйшых газэтаў. У ім чорным па беламу надрукована, што на прапазыцыю зробляную ад Менскаго пачтова-тэлеграфнаго начальства польскаму прэдстаўніцтву, каб вярнуць толькі частку (?) сумы (а ні малая-ж сумма: $8^1/_2$ мільёнаў грашмі і 14 мільёнаў працэнт. паперамі!), узятай польскімі легіёнерамі с почты, пасьля уцечкі бальшэвікоў, начальнік пачтова-тэлеграфнаго округу атрымаў ад польскаго прэдстаўніцтва такі атказ:

«Прэтэнсіі начальніка округу прыняты пад увагу і будуць разгледжаны Польскім Урадам пры рэгуліраванню ўзаемных стасункаў Урадаў Польскаго і Рускаго».

Якое аднашэньне Польскі Урад мае да Менскіх грошы?

Хто калі мог падумаць, што грошы с почты у «Mińsku Litewskim» павінны папасьць у скарбонку да «ржонду Варшавскего»?

—Спрыт! Праўдзівы спрыт! І глаўнае, што тую здрадніцкую **тутэйшую** руку, якая пасьпяшыла выхапіць с шкатулы **тутэйшыя** грошы і перадаць іх чужому, Польскаму Ураду, ніхто ні злавіў.

Ды і лавіць німа каму, бо праўдзівы гаспадар, выгнаны бальшэвікамі ішчэ ні вярнуўся.

Эх, горо, горо!

А. Новадворскі.

Весткі з Расіі.

Бальшэвіцкі арэшт Глаўнай літоўскай Рады у Расіі.

«Dzennik Wilenski» падае узятую ім з «Lict. Aidas» вестку, што 26-27 лютаго гэтаго году бальшэвіцкіе ўласьці у Варонежы арыштавалі членаў Глаўнай Літоўскай Рады у Расіі, ведамых у Вільні літоўскіх дзеячоў.

Кс. Ясеньскаго, М. Сьлежэвіча, А. Даукша,—артысту-маляра, А. Варнаса, докт. Е. Драугеліса і быўшаго члена Думы, Марціна Ічаса.

У Яна Яблонскаго рэвізыі рабілі яго ўласные рукі, шукаючы выданняў Літоўскай Рады. Пасьля рэвізыі у яго узята падпіска аб нівыездзе з Варанежу.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Савет Старшыя рускаго клюбу склікае на 30-ае сакавіка а 5-ай гадз. веч. агульнае саб ранне сваіх членау. Маняцца разбіраць важныя справы: перш на перш а грошах — 13000 рубл., якія у сваім часе паложаны былі у гасударст. ашчэдную кассу. Да прыходу ішчэ немцау у Менск, быушы старшыня клюбу Гагарын вярнуу 5000 р., а астаушыеся 8000 р., як ен заявіу, у яго укралі. Грошы гэтыя сабраны былі с членскіх складак, за ігры у лато, карты і інш.; цяперашняя прапажа 8000 рублеу ставіць савет старшынау у вельмі прыкрае палажэнье, і каб ні браць на сябе атвету,—склікаюць агульны сход.

Другое пытанне, ня менш важнае, гэта зрабіць які парадак з усіх рухомым меннім, якое засталося ад клюбу, каторае цяпер валяецца у складох і глуміцца. Яго маняцца распрадаць да часу членам клюбу. 3-яе пытанне—гэта наняць новую кватэру пад клюб, бо дом на Падгорнай вул. № 50, што куплянъ быу пад клюб за 40000 р., цяпер заняты гэрманскім войскам.

Як удасца наладзіць і зглядзіць гэтыя справы—німа ведама.

Дэмакратычные абеды для служачых пры упрауленні Л. Р. ж. д. ва ст. Менск—налажываюцца зноу. Цана за абед на дзьве стравы застаецца старая—1 рубель (бяз хлеба). Абед треба заказываць днем ранней. Цяпер што дня бывае больш 300 чалавек на абедзе.

Дэлегацiя па харчы.
Шесть членау гарадзкога харчоваго камітэту разам з германскімі вайсковымі чынамі выехалі 25-го г. м. па закупкі у губэрніі і паветы. Аб дэлегаціі (10 чалавек) па харчы на Украіну ішчэ нічого сказаць нельга, бо на гэта не атрымана пакуль што атказу ад гэрманскаго загаду.

Справа вучыцельскаго інстытуту—завісла у паветры. Прыехаушы із Ярослаулю прэдстаунік інстытуту заявіу камісіі народной прасьветы пры гарадзкой управе а канешнай потребе як найхутчейшаго пераводу інстытуту назад у Менск, тым больш, што некаторыя поудневыя месты, прапануючы выгодные варункі, стараюцца пярэцягнуць яго да сябе. Камісія зважаючы на неяснасць палажэння нашаго краю, нічога пэунаго сказаць ні магла, але абецялася зрабіць аб гэтым даклад у думу і управу.

Губэрнскае земство дало пазваленне хаурусу інжэнерау і тэхнікау аткрыць на Васкресенскай вул. рэмонтную майстэрню гаспадарскіх машын.

Разноску лістоу, пасылак інш. Па месьце с сягодняшняго дня ладзіцца бюром інтэлігэнтнай працы пры помачы спэцыяльнай для гэтаго арцелі. Апрача акружнога суду і гарадскай управы, назначаны пункты: пры т-ве эспэрантыстау (серпухоуская №16); кашарны пляц 3 кв. 2, Александроуская № 19, Бабруйская № 2 кв. 4.

Плата да 1/4—30 к; да 5 ф.—2 рубл.; да 10 фунт.—3 рублі

У міравые участковые судьдзі гарадскай думай 26-го сакавіка выбраны: 1) Вэнслаускі, 2) Любшыц, 3) Біруля, 4) Огіеускі, 5) Добровольскі, 6) Кавалік і 7) Мазэ.

У ганорные міровые судзьзі у зьезд выбраны: 1) Фрумкіна Віхман, 2) Вайнштэйн, 3) Гэрцык, 4) Кашчэнко, 5) Злобін 6) Мэйчык, 7) Шапіро, 8) Чаусоу, 9) Віткевіч і 10) Хшонстоускі.

Пэнсіі афіцэрам і чыноунікам сягоння будуць выдаваць у афіцэрскім бюро (Петрапаулауская 50) па картачкам, пачынаючы с № 1001 і тым, што ішчэ раней не атрымалі.

Земская почта за згодай пачтова-тэлеграфнымі гэрманскімі чыноунікамі пачне хадзіць с 1-го мая. Почта захопіць 22 найбольш важных пунктау; напрамак такі: Менск-Ігумен, Барысау—Орша—Бабруйск—Жлобін—Могілеу.

Палажэнне пачтова-тэлеграфных служачых—асабліва тых, што пры бальшэвіках з разношчыкау папалі у вялікіе «чыны» і бралі больш, чым па 400 р. у месяц—не цікавае. Ні маючы с чаго жыць хоцькі-няхоцькі прыходзіцца ехаць у Расію.

Справу аб $22^1/_2$ міліонах рублеу, што захапілі польскіе легіонэры на почці, маніцца разабраць Варшаускі урад пасьля выяснення руска-польскіх адносінау.

Усе аддзелы упраулення Л. Р. ж. д. пачалі зноу сваю працу, хоць пэнсіі і ні атрымоуваюць.

У канторы службы руху, памешканне каторай на палову занято немцамі, працуюць толькі пры адным стале.

Натарыяльные канторы зноу аджылі—тым больш, што хутка пачне працаваць кантора старшаго натаріуса пры акружным судзе, эвакуірованая у 1915 г. у Маскву.

Пакуль што працуюць тры канторы: Барычэусхаго, Фралевіча і Маліноускаго. Чацьвертая быушая добра вядомаго Менску Ільяшэвіча—пакуль што свабодна.

Трэба спадзевацца, што пры цяперашніх варунках быушым «аблакатам» тутэйшым не удастца, як дауней, разстауляць пры канторах натарыяльных сваіх павуковых сетак.

Надзея гаротніка.

Цёмны лес яловы, вольхі, ды асіны,
Грэбля каля млыну, чорная трасіна,
Курныя дзьве хаты, азярод, гумённы,
Хлявушкоў—ні звання, замяст іх—трыстенцы,
Дзе стаіць карова—як раз з рукавіцу...
Як жа ні пазнаць мне тут сваю зямліцу?..
Ходзюць па гародзе нашы дзьве курыцы,—
Іх, сусед, заняўшы, вось будзе сварыцца:
Пойдзе зара спрэчка і цэлая звадка...
Як скула у боку—мне суседа хатка!..
До мне і так гора: ні сьвінчаці—
Ні чаго дакончыць, ні чаго пачаці,—
Жыта ніўдала, ня будзя ячменю,
Хібіла грачыха, лёну будзя з жменю.
Бульба толькі можа зіму падтрымае,—
Добра—калі гэтак... хто ж яго там знае?..
Жонка нешта сохне,—воспу аткачаўшы;
Дзеці памарнелі,—гора запазнаўшы...
Праца падрывае ўсе мае жылы
І што дзень зблізкае да сырой магілы...
Працую ад ранку да самога змроку,
Ад зімы да лета, ад Юр'я да року...
Прадасі на месьці дроў, ці возік моху,
Купіш с горстку солі і жывеш па троху;
Хлеб жуеш з мякінай, запіваеш квасам
І жывеш памалу, і жывеш тым часам...
Запражэш каніну у соху—аруіш,
Потым барануіш, сеіш і гаруіш.
Як часам градам жыта памалоце,
Або як затопя сено на балоце..
Цяжка мне і жыць тут, цяжка і расстацца
З надзеяй, што можа ураджай удастца...
Родная зямліца, родны ты мой край!
Сэрцо ажно млее, быццам відзе рай!..

14/III 1918 г. *Захар Вехаць.*

Аб'яуленне

29 Сакавіка г. г.,—у Вялікую Пятніцу, 31 сакавіка і 1 красавіка г. г.—у дні Св. Уваскресення усе магазыны і гандлевыя завядзення павінны быць **зачынены** ад 10 гадзіны з рана за ўсе гэтыя дні.

Тэатры, кінематографы і іншыя увесяліцельныя завадзеньня забаронены. Распараджэнне гэта ні разыйходзіцца на нямецкіх ваенных.

За нівыпоўненне гэтаго прыказу будзя накладацца штраф на 200 марак с заменаю 6-ці тыднёвым арэштам.

Менск 26/III 1918 г.

Месцовая Комэндантура.

Рэдактар **А. Прушынскі.** Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.